*В.І.Стражаў,*
*міністр адукацыі*

# Ў добры шлях!

У час рэфармавання ўсяго грамадскага развіцця і адукацыйна-выхаваўчай сістэмы адбылася знамянальная падзея ў выдавецкай справе: заснаванне навукова-метадычнага часопіса “Гісторыя: праблемы выкладання”. Дазвольце выказаць надзею, што новае выданне зойме адпаведнае месца ў вырашэнні праблем выкладання гісторыі, якія паўсталі перад гістарычнай адукацыяй і грамадствам.

Стварэнне часопіса — гэта крок наперад у спалучэнні тэорыі гістарычнай навукі, вопыту выкладання і выхавання маладога пакалення. Выкладчыкі сярэдняй і вышэйшай школы будуць мець магчымасць карыстацца здабыткам індывідуальнага вопыту, які з’яўляецца невычарпальнай крыніцай агульных намаганняў у дыдактыцы гісторыі. Разам з тым, часопіс павінен адыграць значную ролю ў павышэнні навукова-метадычных ведаў настаўнікаў. Распрацоўка новых даследчых і педагагічных тэхналогій, дыдактычных сродкаў і іх укараненне ў выкладчыцкую справу — галоўны накірунак дзейнасці выдання.

Жадаю часопісу высока несці асветніцкія ідэі і плённай працы на гэтым вызначальным шляху.


Заснавальнік і выдавец — рэдакцыя часопіса “Адукацыя і выхаванне”

*Галоўны рэдактар*
**У.П.Пархоменка**

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 220-54-81, 220-54-10



Штоквартальны навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з І квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842

**Выпуск 1 ’ 97**
**I квартал**


# ГІСТОРЫЯ: праблемы выкладання




**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
М.І.Мініцкі
*Намеснік галоўнага рэдактара*
Н.М.Ганушчанка
*Адказны сакратар*
Л.В.Саламаха

І.І.Багдановіч
С.К.Ганцова
Г.А.Космач
У.С.Кошалеў
С.В.Паноў
В.В.Сакалова
К.І.Сякацкая
У.В.Тугай
В.М.Фамін
В.М.Шутава



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бібліятэка
БДПУ ... Танка

***Уладзімір Сідарцоў**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства БДУ;*
***Мікалай Мініцкі**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі БДПУ імя М.Танка*

# Праблемы метадалогіі гісторыі

## Да выхаду ў свет вучэбнага дапаможніка для ВНУ “Метадалогія гісторыі”*

Выхад гістарычнай навукі незалежнай Беларусі на навуковую прастору свету дае магчымасць і выклікае неабходнасць далучэння да тэндэнцый развіцця гістарыяграфіі свету, у тым ліку да так важнай для нас тэндэнцыі “ўмеранага гістарызму”. Вырашальным крытэрыем аб’ектыўнасці, у процівагу як аб’ектывісцкаму, так і рэлятывісцкаму падыходам, прызнаецца, на думку вядомага метадолага Т.Хаскела, непрадузятасць гісторыка, які абавязаны ўваходзіць у сістэму поглядаў апанента, здольнасць да самакантролю і самадысцыпліны**.

Варта назваць таксама і патрэбнасць у распрацоўцы новых канцэпцый інтэрпрэтацыі гісторыі, якая выклікаецца цяперашняй крызіснай сітуацыяй у навуцы, і неабходнасць забеспячэння сучаснага ўзроўню тэарэтычнай і метадалагічнай узброенасці даследчыка гісторыі, і важнасць падзелу прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста ў вобласці гістарыяграфіі, для якога гісторыя не на словах, а на справе з’яўлялася б і навукай, і мастацтвам.

Гэта работа з’яўляецца першай спробай стварэння вучэбнага дапаможніка па метадалогіі гісторыі ўласнымі сіламі гісторыкаў, якія зыходзілі са спецыфічнай прыроды гістарычнага пазнання, яго прынцыпаў і метадаў. Да таго ж яна ўяўлялася ім цэлым шэрагам кампанентаў, сярод якіх сам прадмет гістарычнай навукі, суб’ектна-аб’ектныя адносіны ў ёй, яе сацыяльныя функцыі, структура гістарычнага даследавання.

* Методология истории: Учебное пособие для студентов вузов / А.Н.Нечухрин, В.Н.Сидорцов, О.М.Шутова и др. / Под ред. А.Н.Алпеева и др. — Минск: НТООО “ТетраСистемс”, 1996 — 240 с.

** *Могильницкий Б.Г.* Между объективизмом и релятивизмом. Дискуссии в американской историографии // Новая и новейшая история. — 1993. — № 5. — С. 11—12.



**Уводзіны**, аўтарамі якіх з’яўляюцца дактары гістарычных навук, прафесары А.Нечухрын і У.Сідарцоў, раскрываюць прадмет і задачы курса, станаўленне (з 1857 г.) метадалогіі гісторыі як навуковай дысцыпліны, асноўныя сучасныя метадалагічныя канцэпцыі ў гістарычным даследаванні (“памяркоўны гістарызм” і псіхагісторыя ў амерыканскай гістарычнай навуцы, французская школа “Аналаў”, неаліберальны накірунак з яго плюралістычным падыходам да гісторыі ў ФРГ), пошук аптымальных суадносін фармацыйнага, цывілізацыйнага і тэхналагічнага падыходаў у краінах СНД, інфарматызацыю гістарычнай навукі ў многіх краінах Еўропы.

Першая глава дапаможніка прысвечана прадмету гістарычнай навукі. У ёй аналіз пытанняў, якія датычаць асноўных накірункаў трактоўкі прадмета, яго сутнасных і структурных узроўняў, належыць дацэнту М.Мініцкаму*, а пытанні класіфікацыі навук і месца гісторыі ў сістэме грамадска-гуманітарных ведаў выказаны выкладчыкам В.Гарбачовай.

Важную сэнсавую нагрузку ў вызначэнні спецыфікі гістарычнага пазнання ў адрозненне ад натуральна-навуковага ці мастацкага нясуць два наступныя раздзелы дапаможніка, напісаныя А.Нечухрыным (***Глава 2**. Субъектно-объектные отношения в исторической науке и специфика исторического познания. История и современность. **Глава 3**. Социальные функции исторической науки*). Гэта спецыфіка звязана з сацыяльнай прыродай гісторыі, у якой назіраецца якаснае супадзенне суб’екта і аб’екта пазнання, прычым апошні ўяўляецца як свядомая мэтанакіраваная дзейнасць чалавека, недаступная прамому назіранню даследчыка. Адсюль выцякае, па-першае, рэканструкцыйны характар пазнання ў гістарычнай навуцы, які выклікае неабходнасць стварэння пэўнай кантрольнай сістэмы, што засноўвалася б на несупярэчлівасці і ўзгодненасці сапраўдных гістарычных ведаў аднаго з другім, з агульнанавуковай карцінай свету і сучаснай сацыяльнай практыкай; па-другое, яго рэтраспектыўны характар, калі гісторык, разглядаючы завершаныя працэсы, можа больш упэўнена судзіць пра іх генезіс і вынікі, аднак з улікам аднаснасці свайго ўласнага ўспрымання і ўплыву перажываемай ім эпохі, кожная з якіх дадае нешта сваё да гістарычнага вобраза мінулага.

* У прадмове вучэбнага дапаможніка памылкова адсутнічае ўказанне на аўтарскую прыналежнасць гэтага матэрыялу М.Мініцкаму. У другім выданні кнігі гэта памылка будзе ліквідавана.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

“Правільная” метадалогія гістарычнага даследавання, як лічыць А.Нечухрын, сцвярджае, што гістарыяграфія павінна зыходзіць з арыентацыі на фундаментальныя патрэбнасці сучаснасці, абмяжоўваць залежнасць гістарычных пошукаў ад імгненных захапленняў, ставіць межы гістарычнаму рэлятывізму; аднак імкненне да навуковага аб’ектывізму не павінна весці гісторыю ад праблем сучаснасці, бо гэта можа прывесці да застою ў навуцы, згубе да яе грамадскага інтарэсу.

Запыты да гісторыі з боку сучаснасці вызначаюць яе сацыяльныя функцыі, якія неадналькава разумелі ў розныя часы за іх рознага ўзроўню развіцця як самога грамадства, так і навукі. Імі ў сучасным грамадстве з’яўляюцца функцыя сацыяльнай памяці (накапленне і захаванне ў памяці чалавецтва вопыта мінулых пакаленняў), навукова-пазнавальная (прадстаўленне грамадству неабходных ведаў для правільнага рашэння праблем, якія стаяць перад ім), выхаваўчая (зацвярджэнне агульначалавечых каштоўнасцей, ідэалаў свабоды, дэмакратыі і павагі правоў чалавечай асобы), палітыка-ідэалагічная (самастойны водгук на тыя ці іншыя пытанні жыцця сучаснага грамадства).

Гістарычная навука па сваёй структуры ўяўляе складаную і збалансаваную сістэму, у якой вылучаюцца эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні даследавання і арганізацыі ведаў (***Глава 4. Структура исторического исследования***). Кожная з іх валодае сваімі асаблівасцямі функцыянавання.

У якасці базы гістарычнага пазнання выступае **гістарычная крыніца**, як прадукт мэтанакіраванай дзейнасці людзей (аўтары падраздзела А.Нечухрын і У.Сідарцоў). Яна паўстае і як вынік адлюстравання суб’ектам рэальнасці, і як прадукт дзейнасці суб’екта, выступаючы такім чынам і “рэшткам” і “паданнем”. Адсюль выдзяляюцца два важныя этапы крытыкі крыніцы — знешні (устанаўленне яго сапраўднасці) і ўнутраны (вывучэнне сведчанняў крыніцы). Пры гэтым адзначэнне і аналіз яго “схаванай” інфармацыі шляхам звароту да новых метадаў даследавання (колькаснага, псіхафізічнага, мадэлявання і інш.) з’яўляецца адной з найбольш істотных задач даследавання.

Значнае месца ва ўсіх працах па метадалогіі гісторыі адведзена праблеме **гістарычнага факта**, які складае аснову ўсялякай навуковай тэорыі і вызначае субстанцыянальную прыроду гісторыі (А.Нечухрын). Любы навуковы гістарычны факт уяўляе сабой складаную пазнавальную канструкцыю, у якой арганічна злучаюцца аб’ектыўныя (інфармацыя крыніцы) і суб’ектыўныя



элементы. Праверку дакладнасці пазнання можна ажыццявіць толькі шляхам паглыбленай працы з крыніцамі і комплексным выкарыстаннем фактаў. Гэтага дастаткова, каб разглядаць навуковы гістарычны факт як больш ці менш адэкватную рэканструкцыю з’яў і надзейную аснову гістарычнага аналізу.

У правядзенні гістарычнага даследавання ўмоўна можна выдзеліць тры ўзаемазвязаныя аперацыі: 1) збор фактаў, 2) пабудова мадэлі, 3) інтэрпрэтацыя. У рэальнай практыцы паслядоўнасць гэтых аперацый вельмі адносная: яшчэ да навуковага сінтэзу ў гісторыка складаецца папярэдняе меркаванне, якое аказвае ўздзеянне на ўсю працэдуру даследавання. Канчатковая фармулёўка гэтага меркавання ўжо ўяўляе гістарычную тэорыю. Значыць **эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні пазнання ў гістарычным даследаванні** (А.Нечухрын) шчыльна ўзаемазвязаны. Веданне ў гісторыі накіравана як на канкрэтныя факты мінулага (навуковае апісанне), так і на высвятленне прычынна-выніковых сувязей, навуковае тлумачэнне і стварэнне канцэпцыі гістарычнай эвалюцыі.

У метадалогіі гісторыі адной з актуальных задач з’яўляецца пераадоленне супярэчнасці паміж сродкамі пазнання і гістарычнай рэчаіснасцю. Частковае вырашэнне праблемы магчыма на аснове шматмернасці форм **арганізацыі і прадстаўлення гістарычных ведаў** (М.Мініцкі).

Шматмернасць можна разглядаць як адзінства двух асноўных відаў інфармацыі: унутранай (канцэптуальныя, тэарэтычныя, фармальна-лагічныя мадэлі) і знешняй (тэкстуальныя і знакава-сімвальныя формы). Апрацоўка гэтых відаў інфармацыі з дапамогай інфармацыйных тэхналогій дае прынцыпова новае асяроддзе пазнання гісторыі. Без усякага сумнення зварот да візуальных (спалучэнне ўнутранай лагічнай і знешняй фармальнай інфармацыі), гіпертэкставых, фрэймавых (па прынцыпу дрэвавіднай сістэмы, якая разгаліноўваецца) і графічных формаў выражэння інфармацыі набліжае нас да рэальных аб’ектаў рэчаіснасці. І тым не менш нават з дапамогай “мыслячых” машын адлюстраванне не можа стаць адэкватным свету рэальнасцяў.

У ходзе гістарычнага даследавання здзяйсняецца групоўка і класіфікацыя сабранага матэрыялу, што ажыццяўляецца пры дапамозе сістэмы навуковых катэгорый. **Катэгорыі гістарычнай навукі** (У.Сідарцоў) уяўляюць сабой агульныя, фундаментальныя паняцці, якія адлюстроўваюць найбольш істотныя, заканамерныя сувязі і адносіны рэальнай рэчаіснасці і пазнання.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гісторыкі шырока выкарыстоўваюць такія філасофскія катэгорыі, як сутнасць і з'ява, гістарычная неабходнасць і выпадковасць, рэчаіснасць і магчымасць, гістарычная альтэрнатыва і інш.

Характэрнай рысай гістарыяграфіі XX ст. з'яўляецца распрацоўка паняційнага апарату самой гістарычнай навукі. Гэта датычыцца такіх паняццяў, як прастора ў гістарычным сэнсе і гістарычны час, канцэпцыя доўгай часавай працягласці, татальная гісторыя, ідэальны тып, цывілізацыя і інш.

Немалаважнай праблемай з'яўляецца **апісанне ў гістарычнай навуцы** (А.Нечухрын). Яно выходзіць на больш агульнае пытанне аб суадносінах гістарычнага і мастацкага пазнання. Спасціжэнне гісторыі прапаноўвае суперажыванне і эстэтычныя адносіны да мінулага. Аднак калі ў гістарычным творы аб'ектам з'яўляецца "дух эпохі", то ў творы мастацтва — "дух мастака". Мастацкія стандарты набываюць асаблівае значэнне на заключным этапе гістарычнага даследавання — пры напісанні гістарычнай працы.

У якасці **прынцыпаў гістарычнага пазнання** (А.Нечухрын) выступаюць зыходныя паняцці навукі, якія вызначаюць асноўныя спосабы рашэння навуковай праблемы. Змест таго ці іншага прынцыпу выяўляецца ў пэўных патрабаваннях, якіх павінен прытрымлівацца даследчык. Сутнасны бок гістарычнага пазнання вызначаюць прынцыпы гістарызму (вывучэнне любой з'явы гісторыі ў яе генезісе і развіцці, канкрэтна-гістарычнай абумоўленасці і індывідуальнасці), аб'ектыўнасці (атрыманне сапраўдных ведаў аб мінулай рэчаіснасці, адэкватнае яе разуменне і апісанне) і каштоўнасны падыход (аксіялагічны спосаб пазнання, заснаваны на суаднясенні вывучаемых аб'ектаў з тымі або іншымі агульнапрызнанымі каштоўнасцямі). Ад выканання патрабаванняў, якія выцякаюць з дадзеных прынцыпаў, залежыць паспяховае прымяненне адпаведнага метаду, які выступае ў якасці сродка пазнавальнай дзейнасці.

Навуковыя метады складаюць сукупнасць спецыяльных прыёмаў, нормаў, правілаў, працэдураў, якія рэгулююць дзейнасць гісторыка і забяспечваюць рашэнне даследчай задачы (***Глава 6**. Методы исторического познания*). Яны грунтуюцца на філасофскіх і **агульнанавуковых вытоках** (У.Сідарцоў). Апошнія дазваляюць разглядаць рух гістарычных аб'ектаў у прасторы (гістарычны і лагічны метады, узыход ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, індукцыя і дэдукцыя, мадэляванне і інш.). Агульнанавуковыя метады неабходны на тэарэтычным узроўні. У адносінах жа да канкрэтных гістарычных сітуацый іх выкарыстоўваюць з мэтай распрацоўкі спецыяльна-гістарычных метадаў, для якіх яны з'яўляюцца лагічнай асновай.



Спецыяльна гістарычныя метады даследавання ўяўляюць сабой рознае спалучэнне агульнанавуковых метадаў, адаптаваных да асаблівасцяў даследуемых гістарычных аб'ектаў. Яны падраздзяляюцца на традыцыйныя і нетрадыцыйныя. Да ліку **традыцыйных спецыяльна-гістарычных метадаў** (аспірант С.Каўн) гісторыкі адносяць метад класавага аналізу, які шырока выкарыстоўваўся ў СССР, гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, дыяхранічнага аналізу, а таксама рэтраспектыўны метад.

У мэтах найбольш эфектыўнага прымянення гэтых метадаў выпрацоўваюцца адпаведныя правілы і працэдуры, якія завуцца даследчай методыкай, і неабходныя інструментальныя сродкі — тэхніка даследавання.

Значную ролю ў гістарычным даследаванні іграюць псіхалагічныя матывы, якія праяўляюцца ў двух аспектах: з аднаго боку, суб'ект даследавання (гісторык), які непазбежна ўступае ў эмацыянальныя адносіны са сваім аб'ектам, з другога — дзеючыя асобы гісторыі са сваімі пачуццямі, эмоцыямі, захапленнямі, якія ўдзельнічаюць у эканамічных, сацыяльных, палітычных, рэлігійных і іншых адносінах, падпарадкоўваючыся пэўным псіхалагічным законам. Таму зусім натуральным з'явілася ўзнікненне цэлага напрамку ў гістарыяграфіі, які разглядае псіхалагічныя аспекты гістарычнага працэсу і выкарыстоўвае **сацыяльна-псіхалагічны падыход** (апірантка В.Шутава) для гістарычнага тлумачэння.

Дадзены напрамак атрымаў назву псіхагісторыі. Яго базавымі паняццямі, якія маюць несвядомыя карані, з'яўляюцца сны, фантазіі (міфы, казкі, анекдоты, карыкатуры і г.д.), архетыпы (вобразы паводзін, закладзеныя ў кожным з нас) і інш. Вялікую вядомасць атрымала выпрацаваная амерыканскім псіхагісторыкам Л. дэ Мозэ псіхагенетычная тэорыя гісторыі (падыход, заснаваны на перадачы з пакалення ў пакаленне псіхічнай структуры як галоўнай складальнай у распаўсюджанні і развіцці культурных элементаў грамадства).

Характэрнай рысай сучаснага этапу развіцця навукі з'яўляецца інтэнсіфікацыя і ўзаемапранікненне навуковых дысцыплін. У выніку на стыку навук з'яўляюцца новыя навуковыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

напрамкі. Важнейшай складальнай гэтага працэсу з'яўляецца прымяненне **колькасных** (матэматычных) **метадаў** (У.Сідарцоў) у розных галінах навукі, у т.л. гісторыі. Гэта метады шматмернага статыстычнага аналізу (якія арыентуюцца на даследаванне статыстычных сукупнасцяў, у якіх аб'екты даследавання характарызуюцца наборам пэўных прымет), кантэнт-аналіз (звесткі тэксту крыніцы да абмежаванага набору вызначаных элементаў, якія лёгка падвергнуць колькаснай апрацоўцы), метад мадэлявання (даследаванне аб'ектаў на іх матэматычных мадэлях, якія адназначна або адлюстроўваюць гэтыя аб'екты).

Матэматызацыя гістарычных даследаванняў праходзіла, асабліва ў апошнія гады, на фоне працэсу інфарматызацыі грамадства, які бурна развіваецца. У гэтых умовах павелічэнне патрабаванняў гістарычнага крыніцазнаўства і развіццё кліяметрыі абумовілі значнае пранікненне камп'ютэрных тэхналогій у гістарычную навуку. Размова ўжо зайшла аб так званым "камп'ютэрным крыніцазнаўстве" і аб падрыхтоўцы спецыялістаў-гісторыкаў, здольных працаваць у гэтай вобласці без пасрэднікаў.

На стыку "камп'ютэрнага крыніцазнаўства", інфарматыкі і квантытатыўнай гісторыі ўзнікла новая міждысцыплінарная вобласць, якая завецца ў Асацыяцыі "Гісторыя і камп'ютэр" краін СНД як **гістарычная інфарматыка** (У.Сідарцоў) са сваім тэарэтычным кампанентам, уласным паняційным апаратам, базай крыніц і мадэллю структуры той прафесійнай супольнасці, якая бачыць гістарычную інфарматыку сферай сваёй творчай дзейнасці. Практычнымі задачамі яе з'ўляецца распрацоўка агульных падыходаў да прымянення інфармацыйных тэхналогій, стварэнне спецыялізаванага праграмнага забеспячэння ў гістарычных даследаваннях і гістарычнай адукацыі, у т.л. гістарычных баз і банкаў даных (ведаў), камп'ютэрных тэхналогій прадстаўлення і аналізу інфармацыі гістарычных крыніц рознага характару, інфармацыйных сетак, мультымедыя-праграм і іншых інструментальных сродкаў вывучэння і навучання гісторыі.

Дапаможнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай курса "Метадалогія гісторыі", адобраны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Сваім зместам, структурай, формай падачы матэрыялу (вылучэнне ў тэксце ключавых слоў і сказаў, дапаўненне тэксту слоўнікам тэрмінаў — складальнік В.Гарбачова і інш.) яно несумненна будзе дапамагаць студэнтам і маладым вучоным павышаць якасць сваіх даследаванняў, выпрацоўваць і развіваць навыкі самастойнай працы з гіста-



рычнай крыніцай, адэкватна ацэньваць факты і навуковыя канцэпцыі, а настаўнікам фармаваць у школьнікаў творчыя адносіны да вывучэння гісторыі.

У працы над дапаможнікам аўтарскі калектыў, які ўзначальвае доктар гістарычных навук прафесар У.Сідарцоў, абапіраўся на сваіх папярэднікаў, у т.л. Томскую метадалагічную школу Б.Магільніцкага, даследаванні акадэміка РАН І.Кавальчэнкі, дасягненні лабараторыі гістарычный інфарматыкі МГУ і яе загадчыка доктара гістарычных навук прафесара Л.Бародкіна і інш., на падтрымку Гуманітарна-эканамічнага недзяржаўнага інстытута Рэспублікі Беларусь на чале з прафесарам А.Алпеевым. У працы над наступнымі выданнямі аўтары будуць рады атрымаць парады па ўдасканаленню дапаможніка. Водгукі просім накіроўваць па адрасу:

*220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6, п. 20;*
*тэл. (017) 222-36-07, факс (017) 226-01-75,*
*e-mail: sidvn@depsmus.bsu.minsk.by.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУ